# Новыя звесткі да радаводу Антона Лявіцкага

**У газеце «Літаратура і мастацтва» (№ 5 ад 7 лютага 2025 г.) былі апублікаваны выяўленыя запісы аб вянчанні Антона Іванавіча Лявіцкага, пісьменніка, вядомага пад псеўданімам Ядвігін Ш., і Люцыі Гнатоўскай. Таінства вянчання праходзіла ў Радашковіцкім рымска-каталіцкім прыходскім касцёле, запіс зроблены ў метрычных кнігах, якія цяпер захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродне.**

Таксама ў адной з метрычных кніг Радашковіцкага касцёла маецца запіс аб нараджэнні першай дачкі Лявіцкіх — Ванды Антонаўны. Яе дата нараджэння была вядома і раней, з іншых дакументаў, у адрозненне ад родных братоў — Леона (Лявона), Вацлава, Казіміра. Дакладныя даты нараджэння хлопчыкаў у літаратуры не прыводзяцца, вядома толькі, што яны былі маладзейшыя за Ванду і нараджаліся з розніцай у некалькі гадоў. Работа з метрычнымі кнігамі Радашковіцкага касцёла, якія захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску, дазволіла ўдакладніць даныя, хоць і не па ўсіх нованароджаных дакладна. Растлумачым чаму.

Метрычная кніга Радашковіцкага касцёла за 1901 год захавалася не цалкам, першым ідзе раздзел «Аб нованароджаных». Частка старонак страчана, першыя запісы пачынаюцца з 32-й старонкі і зроблены 8 сакавіка. У канцы гэтага раздзела ёсць «Алфавит метрических выписей о родившихся Радошковичского р.-к. приходского костела за 1901 г.», дзе ў алфавітным парадку пададзены прозвішчы, імёны і імёны па бацьку нованароджаных і старонка метрычнай кнігі, на якой быў зроблены запіс. У гэтым спісе ёсць «Левицкий Леонард Антонов» (НГАБ 1781-49-51, арк. 18), то-бок сын пісьменніка, імя пры хрышчэнні — Леанард, магчыма, пазней у сям'і змянілі на Леон, запіс аб нараджэнні-хрышчэнні быў зроблены на 1-й старонцы. На жаль, яна не захавалася, дату нараджэння першага сына А. Лявіцкага дакладна назваць пакуль немагчыма, лакалізаваць можна — Леанард Антонавіч Лявіцкі нарадзіўся і ахрышчаны да 8 сакавіка 1901 года.

На жаль, мы не можам вылучыць версію, што Леанард з'явіўся на свет у студзені 1901 года, хоць нумар па парадку нібы гэта паказвае, бо прыкладам з'яўляецца запіс аб нараджэнні і хрышчэнні наступнага сына Лявіцкіх — Казіміра. У метрычнай кнізе Радашковіцкага касцёла за 1907 год чытаем: «Тысяча девятьсот седьмого года июня третьего дня в Радошковичском Р.-К. приходском костеле окрещен младенец по имени Вацлав ксендзом Бяллозором Вилейским Деканом с совершением всех обрядов Таинства» (НГАБ 1781-49-52, арк. 11ад.-12). Але нарадзіўся хлопчык значна раней — 28 снежня 1906 года, у Карпілаўцы, хроснымі бацькамі сталі Міхаіл Кучынскі і Ганна Басаржэўская. Напэўна, у бацькоў была сур'ёзная прычына, каб адкласці хрышчэнне сына амаль на паўгода.

Малодшы сын Антона і Люцыі Лявіцкіх — Казімір — з'явіўся на свет праз тры гады пасля Вацлава, нарадзіўся 13 чэрвеня 1909 года, ахрышчаны 14 чэрвеня 1909 года ў Радашковіцкім касцёле (НГАБ 1781-49-52, арк. 104адв.-105). Таінства хрышчэння праводзіў той самы Вілейскі дэкан, ксёндз В. Белазор, хроснымі бацькамі сталі Юрый Навіцкі і Марыя Шышко. Малодшы сын нарадзіўся таксама ў Карпілаўцы, але адзначаем: яго бацькі пазначаны ўжо як віленскія дваране, што, напэўна, паказвае на асноўнае месца пражывання сям'і Лявіцкіх.



І яшчэ адзін запіс, гэтым разам сумны для Антона Лявіцкага, удалося выявіць у метрычнай кнізе Радашковіцкага касцёла за 1909 год. У частцы 3 «Аб памерлых» за № 19 зроблены запіс: «Тысяча девятьсот девятого года марта двенадцатого дня в им. Карпиловке умерла Ольга, урожденная Валицкая, Левицкая, от чахотки, быв причащена Св. тайн». Згодна правілаў запісаў у каталіцкіх метрычных кнігах, пазначалася: якога быў стану памерлы, якое меў званне, да якога саслоўя адносіўся, колькі пражыў, з якога прыходу і каго з дзяцей, нават дарослых, пакінуў. З запісу ў гэтай графе становіцца вядома, што Лявіцкая Вольга — удава, дваранка, пражыла 68 гадоў, адносілася да Радашковіцкага прыходу, пакінула сына Антонія. Пахавана прыхаджанамі касцёла 15 сакавіка 1909 года на Радашковіцкіх могілках.

Такім чынам, работа з метрычнымі кнігамі Радашковіцкага рымска-каталіцкага прыходскага касцёла за 1901—1909 гг. дазволіла выявіць наступныя звесткі да радаводу пісьменніка Ядвігіна Ш. — Антона Іванавіча Лявіцкага: старэйшы з яго сыноў Леанард нарадзіўся да 1 сакавіка 1901 г., другі сын Вацлаў — 28 снежня 1906 г., самы малодшы сын Казімір — 13 чэрвеня 1909 г. Усе дзеці Антона і Люцыі нарадзіліся ў маёнтку Карпілаўка, ахрышчаны ў Радашковічах. Таксама выяўлены запіс аб смерці маці Антона Іванавіча — Вольгі Лявіцкай — 12 сакавіка 1909 г. з указаннем месца пахавання. Звесткі не толькі ўдакладняюць біяграфічныя даныя Антона Лявіцкага, але і даюць магчымасць лепш зразумець яго сямейнае акружэнне і сацыяльны кантэкст. Акрамя таго, выяўленыя запісы адкрываюць новыя магчымасці для даследчых прац, звязаных з вывучэннем жыцця і творчасці пісьменніка, а таксама яго сямейных сувязей.

**Ірына МЫШКАВЕЦ,**
**вядучы навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Максіма Багдановіча**
**Фота даслана аўтарам**